8. Речь Архиепископа Георгия (Конисского), сказанная 15 марта 1789 года при открытии в Могилёве Главного народного училища // Могилёвские епархиальные ведомости. – 1895. – № 21. – Часть неофициальная. – С. 363–365.

9. Устав народным училищам в Российской империи, 1786 г. / Сост. Н. А. Желваков // Хрестоматия по истории педагогики. – Москва, 1938. – Т. 4, ч. 1. – 548 с.

УДК 93/94

***Я. А. Бодрыкаў***

# ДЗЕЙНАСЦЬ МІНСКАГА АДДЗЕЛА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ДАПАМОГІ ПАЦЯРПЕЛЫМ АД ВАЙНЫ (1915–1917 ГГ.)

**Анатацыя.** Першая сусветная вайна прывяла да карэнных пераўтварэнняў у сферы дабрачыннасці ў Расійскай імперыі. З'яўленне вялікай колькасці бежанцаў і разбурэнні ад ваенных дзеянняў у заходніх губернях прымусілі царскі ўрад даць дазвол на дзейнасць шматлікіх недзяржаўных нацыянальных дабрачынных арганізацый, сярод якіх з'явілася і Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (БТДПВ). Адным з найбуйнейшых аддзелаў таварыства стаў Мінскі аддзел, які пасля нямецкай акупацыі Вільні ў верасні 1915 г. стаў фактычна галоўным кіруючым органам таварыства на неакупаванай тэрыторыі беларускіх губерняў. Дабрачынная, грамадская і культурна-адукацыйная дзейнасць Мінскага аддзела БТДПВ аказала значны ўплыў на развіццё беларускага нацыянальнага руху і стварэнне сеткі ўстаноў сацыяльнай дапамогі для пацярпелага насельніцтва ў Мінску.
**Ключавыя словы**: Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, дабрачыннасць, бежанцы, беларускі нацыянальны рух.

У айчыннай гістарыяграфіі Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны неаднаразова станавілася аб'ектам для вывучэння навукоўцаў. Аднак дзейнасць Мінскага аддзела таварыства даследавана не так грунтоўна. Акрамя таго, большасць навуковых прац па дадзенаму пытанню закранае дзейнасць БТДПВ у кантэксце больш шырокіх праблем або даследуе толькі пэўны аспект дзейнасці таварыства. Так, асобныя аспекты дзейнасці Мінскага аддзела БТДПВ закранаюцца ў манаграфіях В. Р. Карнялюка [1], С. Ф. Лапановіча [2, 3], М. В. Цубы [4], М. Б. Шчаўлінскага [5], артыкулах В. У. Скалабана [6], М. В. Цубы [7] і А. І. Шамякінай [8]. Варта адзначыць біяграфічныя даследаванні асоб, чыя дзейнасць была шчыльна звязана з дзейнасцю таварыства – Вацлава Іваноўскага (аўтар Ю. Туронак) [9], Рамана Скірмунта (аўтар А. Ф. Смалянчук) [10] і Паўла Аляксюка (аўтар А. М. Чарнякевіч) [11].

Баявыя дзеянні на тэрыторыі Расійскай імперыі і павелічэнне колькасці бежанцаў, дапамогу якім у поўным памеры ўжо не маглі аказваць дзяржаўныя органы і службы, прымусілі царскі ўрад даць дазвол на дзейнасць нацыянальных дабрачынных арганізацый. Такім чынам, у красавіку 1915 г. у Вільні пачало сваю дзейнасць Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (вядомае таксама як Беларускае таварыства дапамогі ахвярам вайны ці

Беларускае таварыства па аказанню помачы пацярпеўшым ад вайны) [12, арк. 143 адв.]. Мэтай дзейнасці дабрачыннай арганізацыі абвяшчалася аказанне дапамогі насельніцтву, якое пацярпела ад вайны, у тым ліку і бежанцам. Старшынёй (маршалкам) таварыства быў абраны Вацлаў Іваноўскі, яго намеснікамі – Антон Луцкевіч і Вацлаў Ластоўскі. Акрамя таго, у праўленне таварыства ўваходзілі такія вядомыя дзеячы, як Павел Аляксюк, Уладзіслаў Сталыгва, Ігнат Буйніцкі і інш. Агульнае ўпраўленне справамі арганізацыі належала Камітэту таварыства. Членам арганізацыі мог стаць любы чалавек, у незалежнасці ад полу, нацыянальнасці і веравызнання, калі ён спачуваў мэтам таварыства і меў права на ўступленне ў арганізацыі па заканадаўству Расійскай імперыі [13, арк. 6–7].

Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны было створана ў Вільні, аднак абвяшчала тэрыторыяй сваёй дзейнасці Віленскую, Гродзенскую, Віцебскую, Мінскую і Магілёўскую губерні. Варта адзначыць, што менавіта ў гэтых губернях, згодна перапісу 1897 г., большасць насельніцтва прызнавала роднай мовай беларускаю і, адпаведна, лічылася беларусамі. Згодна з 19-м артыкулам Статута таварыства члены БТДПВ маглі адкрываць мясцовыя аддзелы на тэрыторыі азначаных пяці губерняў. Такія аддзелы павінны былі налічваць не менш 5-ці членаў з мясцовых жыхароў, кіравацца Статутам таварыства і інструкцыяй, якую выдаваў Камітэт БТДПВ. Акрамя таго, мясцовыя аддзелы не мелі права набываць нерухомасць, а ўсе даходы аддзелаў лічыліся фінансавымі сродкамі ўсяго таварыства. Разам з тым кожны аддзел таварыства для ажыццяўлення сваіх мясцовых задач павінен быў абраць уласны мясцовы Камітэт колькасцю не менш за 3-х чалавек [13, арк. 11–11 адв.].

Нягледзячы на абмежаваныя фінансавыя магчымасці, БТДПВ ужо ў першыя месяцы сваёй дзейнасці істотна пашырыла свой уплыў. У чэрвені – ліпені 1915 г. таварыства адкрыла мясцовыя аддзелы ў Мінску, Дзісне, Вілейцы, Полацку, Празароках, Друскеніках і Гожы. Найбуйнейшым і найбольш актыўным сярод новых аддзелаў стаў менавіта Мінскі аддзел [4, с. 107].

Летам – восенню 1915 г. становішча на расійска-германскім фронце істотна пагоршылася, Віленская і Гродзенская губерні апынуліся пад нямецкай акупацыяй. Частка кіраўніцтва БТДПВ, сярод якіх Вацлаў Іваноўскі і Павел Аляксюк, эвакуіравалася ва ўнутраныя губерні Расійскай імперыі. У выніку Вацлаў Іваноўскі апынуўся ў Петраградзе, дзе перайшоў на працу ў Міністэрства земляробства [9, с. 87]. Такім чынам, з восені 1915 г. сувязь паміж праўленнем БТДПВ у Вільні і Мінскім аддзелам таварыства знікла. Можна сцвярджаць, што Мінскі аддзел БТДПВ з канца 1915 г. стаў самастойнай арганізацыяй.

У 1915 – пачатку 1917 г. у дзейнасці Мінскага аддзела БТДПВ удзельнічалі каля 50-ці чалавек. Першым старшынёю аддзела быў абраны адвакат Віктар Чавусаў [2, с. 105]. Актыўнымі дзеячамі аддзела сталі пісьменнік Антон Лявіцкі і яго дачка Ванда Лявіцкая, пісьменнікі Уладзіслаў Галубок

і Змітрок Бядуля, святар Аляксандр Астрамовіч і пісьменніца Людвіка Сівіцкая (вядомая пад псеўданімам Зоська Верас), якая выконвала сакратарскія функцыі і пакінула ўспаміны пра працу ў БТДПВ [14, с. 104–110]. Далучыўся да дзейнасці Мінскага аддзела і Павел Аляксюк, які пазней быў мабілізаваны ў расійскую армію [11, с. 21]. Восенню 1916 г. актыўны ўдзел у працы Мінскага аддзела БТДПВ прымаў паэт Максім Багдановіч, які выдаў некалькі публіцыстычных артыкулаў аб дзейнасці аддзела пад псеўданімам М. Осьмак [8, с. 161]. Можна сцвярджаць, што найбольш актыўную дзейнасць у складзе Мінскага аддзела БТДПВ праводзіла інтэлігенцыя. Гэта абумовіла вялікую ўвагу культурна-адукацыйнай дзейнасці сярод бежанцаў-беларусаў, якую праводзіў аддзел.

Першачарговай задачай як усяго таварыства, так і яго Мінскага аддзела была дабрачынная дапамога пацярпелым ад вайны. У Мінску галоўным чынам гэта тычылася бежанцаў. Ужо восенню 1915 г. аддзелам былі адкрытыя дзіцячыя прытулкі ў раёнах Камароўкі і Залатой Горкі [5, с. 25]. Акрамя таго, былі створаны некалькі начлежных прытулкаў для бежанцаў, дзве бясплатныя і адна платная сталовыя. Апошняя атрымала назву «Беларуская хатка» і стала адыгрываць ролю клуба Мінскага аддзела БТДПВ. З-за недахопу фінансавых сродкаў вясной 1916 г. бясплатныя сталовыя былі закрыты. Усяго да гэтага часу сталовыя выдалі 16 тысяч бясплатных і 10 тысяч платных абедаў [15, с. 190].

Акрамя азначанай дапамогі, Мінскі аддзел БТДПВ спрабаваў дапамагчы бежанцам з працаўладкаваннем. Так, у студзені 1916 г. аддзел арганізаваў раздачу ільну на пражу, дзякуючы чаму часовы заробак знайшлі 150 жанчын. Акрамя таго, намаганнямі Мінскага аддзела каля 700 жанчын былі ўладкаваныя на выкананне дзяржаўнага заказу па пашыву салдацкай бялізны [15, с. 204]. Намаганнямі Мінскага аддзела таварыства былі заснаваныя майстэрня па рамонце ваеннага абсталявання і ткацкая майстэрня [6, с. 182] .

Па меркаванню некаторых даследчыкаў, з-за адсутнасці дастатковых сродкаў у БТДПВ асноўная ўвага надавалася нацыянальна-асветніцкай дзейнасці [1, с. 114]. Разам з тым актыўная дзейнасць Мінскага аддзела таварыства ў галіне культуры і адукацыі можа быць звязана менавіта з сацыяльна-прафесійным складам членаў арганізацыі, сярод актыўнай часткі якіх пераважала інтэлігенцыя. Дзейнасць у галіне адукацыі і культуры была адным з найбольш актыўных і паспяховых напрамкаў працы Мінскага аддзела таварыства і спрыяла павелічэнню граматнасці і нацыянальнай свядомасці сярод насельніцтва Мінска. У маі 1916 г. член БТДПВ Вільгельм Русецкі звярнуўся да ўладаў Мінскай губерні з просьбай даць дазвол на выданне штотыднёвай беларускамоўнай газеты «Беларусь», аднак атрымаў адмоўны адказ [10, с. 251].

Вялікая ўвага надавалася адукацыі бежанцаў усіх узростаў. Для дарослых былі адкрыты сельскагаспадарчыя курсы, дзе заняткі вяліся на беларускай мове. Таксама беларускамоўным было навучанне для многіх дзяцей, якія знаходзіліся ў прыютах таварыства. Па ўспамінах Зоські Верас, Таццянінскі

камітэт адмовіў у грашовых субсідыях на ўтрыманне дзіцячага прытулку. У выніку дзецi апекаваліся выключна за сродкі таварыства і ахвяраванні. Пры гэтым, улічваючы фінансавую самастойнасць у справе выхавання і адукацыі дзяцей, Мінскі аддзел БТДПВ паставіў умовы аб навучанні вучняў на беларускай мове [14, с. 107].

Значную ролю ў культурным жыцці беларускага насельніцтва Мінска адыгрываў клуб «Беларуская хатка», створаны на базе платнай сталовай. У гэты перыяд «Беларускай хаткай» былі пастаўлены п’есы Янкі Купалы і Каруся Каганца. Праводзіліся дабрачынныя, асветніцкія і святочныя мерапрыемствы, падчас якіх таварыства збірала ахвяраванні на карысць параненым, бежанцам і салдацкім сем’ям [7, с. 28]. У «Беларускай хатцы» адбываліся сустрэчы з Максімам Багдановічам, які восенню 1916 г. актыўна дапамагаў Мінскаму аддзелу БТДПВ і сам займаўся дабрачыннасцю. Так, па ўспамінах Зоські Верас, Максім Багдановіч ахвяраваў дзецям бежанцаў паўпуда цукру, які назапашваў з уласнага харчовага пайка [14, с. 106]. У лістападзе 1916 г. кіраўнік Мінскага аддзела таварыства Віктар Чавусаў падаў прашэнне на імя губернатара аб правядзенні Максімам Багдановічам беларускамоўнай публічнай лекцыі «Беларускае Адраджэнне». Аднак губернатар адхіліў прашэнне [10, с. 253].

Як ужо адзначалася вышэй, Мінскі аддзел БТДПВ у сваёй дзейнасці неаднаразова сутыкаўся з недахопам фінансавых сродкаў. Гэта прывяло да скасавання некаторых дабрачынных ініцыятыў, у тым ліку закрыцця бясплатных сталовых [3, с. 243]. Паводле ўспамінаў, Віктар Чавусаў быў фармальным кіраўніком і асабліва не цікавіўся справамі таварыства, аднак меў пэўныя сувязі сярод мясцовых уладаў. Але ў канцы 1916 г. членамі Мінскага аддзела БТДПВ было прынята рашэнне запрасіць да ўдзелу ў працы таварыства буйнога землеўласніка Рамана Скірмунта, каб у далейшым перадаць кіраванне аддзелам у яго рукі. Па меркаванню А. Ф. Смалянчука, у гэтым пытанні запрасіў Рамана Скірмунта да працы ў БТДПВ Максім Багдановіч. У выніку ў студзені 1917 г. Раман Скірмунт узначаліў Мінскі аддзел БТДПВ. Варта адзначыць, што разам з новым кіраўніком у пасяджэннях Мінскага аддзела прымалі ўдзел прадстаўнікі магнацкага роду Радзівілаў: Магдалена Радзівіл і Станіслаў Радзівіл [10, с. 257].

Дзейнасць Рамана Скірмунта на чале Мінскага аддзела БТДПВ не была працяглай. Ва ўмовах агульнай палітызацыі грамадства і актывізацыі беларускага нацыянальнага руху пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Раман Скірмунт ініцыяваў пераўтварэнне дабрачыннай арганізацыі ў Беларускі камітэт (вядомы таксама як Беларускі нацыянальны камітэт), які ставіў перад сабой у першую чаргу ўжо палітычныя мэты [10, с. 259]. Такім чынам, у сакавіку 1917 г. дзейнасць Мінскага аддзела БТДПВ фактычна скончылася.

Трэба адзначыць, што Мінскі аддзел БТДПВ адыграў важную ролю ў кансалідацыі беларускіх нацыянальных дзеячаў напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі і стаў нефармальным цэнтрам беларускага нацыянальнага руху на

неакупаванай частцы беларускіх губерняў. Дзейнасць аддзела спрыяла паступоваму пашырэнню беларускай свядомасці ў часткі бежанцаў і мясцовых жыхароў Мінска, дапамагала рэалізацыі творчага патэнцыялу мінскай беларускай інтэлігенцыі ва ўмовах вайны. У той жа час вынікі дабрачыннай дзейнасці Мінскага аддзела таварыства можна лічыць больш сціплымі, у першую чаргу з-за недастатковага фінансавання, меншых рэсурсаў і магчымасцяў арганізацыі ў параўнанні з агульнадзяржаўнымі і праўрадавымі аб'яднаннямі. Арганізацыя дзейнічала пераважна за кошт ахвяраванняў і доўгі час не мела заможных спонсараў, што ўплывала на памеры яе дапамогі насельніцтву. Аднак нават такая дзейнасць не была залішняй, улічваючы колькасць пацярпелых ад вайны ў Мінску ў 1915–1917 гг., іх сацыяльны, матэрыяльны і псіхалагічны стан.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. **Карнялюк, В. Р.** Міграцыя беларускага насельніцтва, выкліканая Першай сусветнай вайной: манаграфія / В. Р. Карнялюк. – Гродна: ГрДУ, 2019. – 329 с.
2. **Лапановіч, С. Ф.** Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны (1914 – кастрычнік 1917 г.) / С. Ф. Лапановіч. – Мінск: Акадэмія МУС, 2010. – 126 с.
3. **Лапановіч, С. Ф.** Бежанства і эвакуацыя на тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў / С. Ф. Лапановіч. – Мінск: Акадэмія МУС, 2020. – 425 с.
4. **Цуба, М. В.** Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі з пачатку Першай сусветнай вайны да Лютаўскай рэвалюцыі (жнівень 1914 – люты 1917 г.): матэрыялы да курса «Гісторыя Беларусі» / М. В. Цуба. – Мінск: [б. в.], 2006. – 230 с.
5. **Щавлинский, Н. Б.** Белорусское национальное движение в годы Первой мировой войны (1914–1918 гг.) / Н. Б. Щавлинский. – Минск : РИВШ БГУ, 2001. – 136 с.
6. **Скалабан, В. У.** Мінскі аддзел Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны / В. Скалабан // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1999. – Т. 5. – С. 182.
7. **Цуба, М. В.** Нацыянальна-культурная і дабрачынная дзейнасць Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (1915–1917 гг.) / М. В. Цуба // Вестн. Полес. гос. ун-та. – 2012. – № 2. – С. 21–30.
8. **Шамякіна, А. І.** Параўнальны аналіз артыкулаў «Агляд працы за першы год Мінскага аддзела Беларускага таварыства для помачы пацярпеўшым ад вайны» і «Деятельность Минского белорусского комитета» / А. І. Шамякіна // Максім Багдановіч і яго эпоха: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 27 лістапада 2007 г. – Мінск, 2009. – С. 160–162.
9. **Туронак, Ю.** Вацлаў Іваноўскі і адраджэнне Беларусі: пер. з пол. / Ю. Туронак. – Мінск: Медисонт, 2006. – 178 с.
10. **Смалянчук, А. Ф.** Раман Скірмунт (1868–1939): жыццяпіс грамадзяніна Краю: апошнім грамадзянам Вялікага Княства Літоўскага прысвячаецца / А. Ф. Смалянчук. – Мінск: Зміцер Колас, 2018. – 692 с.
11. **Чарнякевіч, А. М.** Чужы сярод чужых: Павел Аляксюк і беларускія «паланафілы» / А. М. Чарнякевіч. – Мінск: А. М. Янушкевіч, 2017. – 315 с.
12. Дакументы школьнай камісіі Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (пратаколы, спісы настаўнікаў, расклад лекцый, праграмы, пасведчанні і інш.) за 1913–1916 гг. на беларускай, украінскай, нямецкай, польскай, рускай мовах // Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 124.

13. Статуты Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны за 1915, 1921, 1923 гг. // Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 125.

14. Шлях паэта: зборнік успамінаў і біяграфічных матэрыялаў пра Максіма Багдановіча / Склад. Н. Б. Ватацы. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1975. – 319 с.

15. **Багдановіч, М. А.** Поўны збор твораў: у 3 т. Т. 3. Публіцыстыка, лісты, летапіс жыцця і творчасці / М. А. Багдановіч. – 1995. – 460 с.

УДК 94 (47)

***А. А. Вологдин***

# СОЗДАНИЕ И ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ РУССКО-АНГЛИЙСКОЙ ТОРГОВОЙ ПАЛАТЫ В ПЕТЕРБУРГЕ

**Аннотация.** Русско-английская торговая палата в Петербурге (РАТП) была создана для содействия экономическому сближению двух стран и расширения взаимной торговли. 22 декабря 1908 г. Устав Русско-английской торговой палаты утвердил император Николай II. В марте 1909 г. прошло первое общее собрание членов РАТП. Первым Председателем Совета РАТП был избран В. И. Тимирязев. Русско-английская торговая палата приняла активное участие в расширении торгово-экономических связей двух стран. К концу 1916 г. общее число действительных членов РАТП в России и за рубежом достигло 1812.

**Ключевые слова**: торговые палаты, Англия, Россия, внешняя торговля, В. И. Тимирязев, русско-английские экономические отношения.

Начало XX в. характеризуется ростом экономических связей и торговли между Великобританией и Россией. Расширение экономического сотрудничества пробудило в предпринимательских кругах этих стран осознание общности интересов. Представители торговли, промышленности и финансов проявляли искреннюю заинтересованность в развитии прямого товарооборота и исключения, по возможности, посредничества третьих стран. Результатом этих настроений стало почти одновременное открытие в Англии и России Русского отдела при Лондонской торговой палате и Русско-английской торговой палаты в Петербурге (далее – РАТП). Оба учреждения были созданы для содействия экономическому сближению двух стран и расширения взаимной торговли.

Первым был создан Русский отдел при Лондонской торговой палате, а уже 12 октября 1908 г. в помещении клуба Петербургского коммерческого общества под председательством члена Государственного совета, бывшего министра торговли и промышленности Василия Ивановича Тимирязева состоялось собрание, в котором приняли участие ряд депутатов Государственной думы и членов Государственного совета, представители Министерства торговли и промышленности, биржевых комитетов, известные российские предпринимате-